# Паверх цэнзурных бар'ераў

## Як публіцысты газеты «Северо-Западный край» у пачатку XX ст. змагаліся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа

УДК 070(476)(091)+94(476)«19»



**Пётр ДАРАШЧОНАК, кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

**Пётр ДАРАШЧОНАК. Паверх цэнзурных бар'ераў.** У артыкуле прааналізаваны матэрыялы газеты «Северо-Западный край», прысвечаныя пытанням сацыяльна-эканамічнага і культурна-нацыянальнага развіцця Беларусі напярэдадні і ў час Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў.

**Ключавыя словы:** палітычныя партыі, беларускі рух, нацыянальная самасвядомасць, цэнзура, перыядычны друк.

**Piotr DARASHCHONAK. Over censorship barriers.** The article analyzes the materials of the newspaper "North-Western Region" devoted to socio-economic and cultural-national development of Belarus in the run-up and during the First Russian Revolution of 1905–1907.

**Keywords:** political parties, Belarusian movement, national identity, censorship, periodical press.

## Прэтэндэнт на лідарства

У лістападзе 2022 года споўнілася 120 гадоў з дня выхаду «общественной, политической и литературной газеты» «Северо-Западный край» (01.11.1902–08.12.1905). Выданне, якое працягвала найлепшыя прагрэсіўна-дэмакратычныя традыцыі «Минского листка» (1886–1902), стала прыкметнай з'явай у грамадска-палітычным жыцці Беларусі напярэдадні і ў час Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў, зрабіла вялікі ўклад у развіццё рэвалюцыйнай свядомасці працоўных і нацыянальнай культуры беларускага народа.

### ПРА АЎТАРА

ДАРАШЧОНАК Пётр Леанідавіч.

Нарадзіўся ў 1953 годзе ў в. Самсоны Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1979).

Працаваў рэдактарам газеты «Советский медик» Мінскага дзяржаўнага медінстытута; намеснікам адказнага сакратара, загадчыкам аддзела гарадской гаспадаркі газеты «Вечерний Минск». З 1991 года – выкладчык кафедры гісторыі журналістыкі журфака БДУ. У 1996 годзе – дэкан факультэта журналістыкі БДУ. У 1997–1998 гадах працаваў кіраўніком прэс-службы Белдзяржуніверсітэта. У 1998–2014 гадах – загадчык кафедры гісторыі журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ. Цяпер дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ.

Кандыдат філалагічных навук (1993), дацэнт (1997).

Аўтар каля 100 навуковых работ.

Сфера навуковых інтарэсаў: праблемы беларускай дзяржаўнасці ў публіцыстыцы XIX–XX стагоддзяў.

Газета «Северо-Западный край» выдавалася ў губернскім Мінску на рускай мове. За 37 месяцаў існавання выйшаў 801 нумар. Яе выдаўцом і рэдактарам быў М.П. Мысаўской, які ў 1902 годзе набыў права на выданне «Минского листка» за 5000 рублёў у папярэдняга рэдактара І.П. Фацінскага, а ў кастрычніку таго ж года Галоўнае ўпраўленне па справах друку адобрыла яго хадайніцтва аб перайменаванні газеты ў «Северо-Западный край» з адначасовым пашырэннем праграмы і аб'ёму газеты.

Новая назва выклікала пытанні ў былога супрацоўніка «Минского листка», які ўбачыў у гэтым спробу кардынальна памяняць змест газеты. Рэдактар М. Мысаўской апублікаваў у № 9 «Северо-Западного края» за 1902 год матэрыял «Злобы дня», у якім падрабязна растлумачыў: «Из маленькой газеты „Минский Листок", выходившей не ежедневно, выросла большая ежедневная газета, – газета всеми силами старающаяся отражать жизнь того края, которому она должна служить и хочет служить… Уважаемый Мих Сах… совершенно запамятовал о том, что еще задолго до перехода „Минского Листка" к новому издателю дважды возбуждалось ходатайство о перекрещении „Листка" в „Северо-Западный Край". Руководить газетой пять лет и забыть о таком факте – вот в чем, по моему мнению, кроется возникшее недоразумение. Мы же, смею заверить М. С., чтим всех сотрудников „Минского Листка" – безгранично. Их прошлый упорный труд дал возможность – расцвести „Минскому Листку" и преобразиться в большую ежедневную газету… Имена руководителей и всех вообще сотрудников „Минского Листка" „хоть в семи водах крести название газеты" – останутся навсегда в истории газеты.

Следует только пожелать, чтобы газета улучшалась не с внешней лишь стороны. Вот какого пожелания мы вправе были ожидать от лица, близко стоявшего к делу, если память о сотрудниках ему, действительно, дорога. Только от содержания и направления газеты зависит прочность ее существования, – в противном же случае, не только имена главных руководителей могут стереться, но даже и имена маленьких незаметных сотрудников» *[1]*.



№ 746. Воскресенье, 15 мая 1905 г. Годъ XX № 746. Воскресенье, 15 мая 1905 г.

# СѢВЕРО-ЗАПАДНЫЙ КРАЙ

ВЫХОДИТЪ въ Минскѣ губ. ЕЖЕДНЕВНО

СТРОИТЕЛИ ЖИЗНИ

Минскій лѣтній театръ.

Іудейскій Король Лиръ

Въ Минскомъ ОБЩЕСТВЕННОМЪ СОБРАНІИ сдается содержаніе БУФЕТА

Въ лѣтнемъ Губернаторскомъ саду открытъ РЕСТОРАНЪ

ЦИРКЪ БР. ТРУЦЦИ

Король лѣсовъ

Агентство О-ва „Граммофонъ"

З. Б. ПРОТАСЪ

Рояли и Піанино

Р. А. Дидерихсъ, Р. Герсъ-Кальмана и др.

15 лѣтъ практики.

ЛЕВАНДОВСКОЙ

Въ типографіи газеты „Сѣв.-Зап. Край"

Д. БОХАНА Изъ польской поэзіи.

Телеграммы „Сѣверо-Западнаго Края". Петербургскаго Телеграфнаго Агентства.

ПИВО

«Северо-Западный край», 1905 год, № 746

М. Мысаўской падпісаў гэту публікацыю псеўданімам Эръ. Неўзабаве ён зноў вярнуўся да праграмы «Северо-Западного края» ў публікацыі «Ответ», надрукаванай ужо пад уласным прозвішчам, дзе літаральна «высцебаў» звольненага ў 1903 годзе з пасады кіраўніка «Виленского вестника» П. Бывалькевіча. На думку М. Мысаўскога, Бывалькевіч не змог знайсці ў сабе смеласць прызнаць, што звольнены за «проповедь человеконенавистничества», «клевету на Россию и русских»: «г-н Бывалькевич, с развязною наглостью начинает отделывать тех, кои осмелились презрительно отнестись к его журнальной деятельности, и, в том числе, меня. По словам г-на Бывалькевича, я „неуч", какой-то „мастер", только недавно сбросивший с себя „рабочую блузу"; что я не пишу, а „литературничаю" и т. д.



Карусь Каганец (К. Кастравіцкі) друкаваўся ў газеце «Северо-Западный край»

Да, г-н Бывалькевич, правда: вашей науке я не учился, да и впредь не намерен; но „мастером" я никогда не был, – я был только рабочим, и ту одежду, в которой я исполнял тяжелый труд работника, я не сбрасывал, а храню, как святыню… Но больше всего возмущает г-на Бывалькевича перемена мною названия газеты. Не может он забыть и простить мне, что милый его сердцу „Минский Листок", певший в унисон с „Виленским Вестником" и следовавший по его указке, похоронен мною навсегда, а с ним вместе исчезли из газеты и те „моськи", человеконенавистнический лай которых был так приятен сердцу соратника „газетного борца, Н.А. Крушевана" – г-ну Бывалькевичу» *[2]*.

На думку даследчыкаў, газета «Северо-Западный край» за тры гады выхаду стала не толькі ўплывовым грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным выданнем, але і рэальным прэтэндэнтам на лідарства ў СМІ Беларусі і Літвы. Распаўсюджвалася выданне па ўсёй тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю, на яго старонках друкаваліся артыкулы, карэспандэнцыі, лісты, заметкі з Бабруйска, Барысава, Вільні, Капыля, Пінска, Слуцка, Смаргоні, іншых гарадоў і мястэчак. Выданне мела звыш 20 рубрык-раздзелаў, якія дасталіся яму «ў спадчыну» ад «Минского листка»: «Местная хроника», «Политическое обозрение», «Последняя почта», «Беллетристика», «Телеграммы», «Фельетоны» і інш. Паводле некаторых звестак тыраж газеты дасягаў амаль восем тысяч экзэмпляраў.

Вялікую цікавасць праяўлялі даследчыкі газеты «Северо-Западный край» да асоб рэдактараў і супрацоўнікаў. Архіў газеты не захаваўся, многія матэрыялы ў газеце падпісваліся псеўданімамі (крыптонімамі) ці выходзілі без подпісу, прозвішчы асобных аўтараў і нават супрацоўнікаў рэдакцыі застаюцца невядомымі.

Рэдактарамі выдання былі І.П. Сітніч, К.І. Зіноўеў, В.М. Шчагляцьеў, І.П. Фацінскі, М.П. Мысаўской, О.П. Мысаўская.

Супрацоўнікі – К.Ю. Чапінскі (сакратар рэдакцыі), М.П. Лукоўскі, Я.М. Окунеў. Друкаваліся Ф. Ястрэмскі, А. Анекштэйн (псеўданім Арк. А–н.), Я. Чымішлійскі, М. Ржэвускі, М. Караліцкі, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец), С. Барташэвіч, Р. Цягла, Л. Радзін, А. Мікульчык, С. Лукашын, С. Някрасаў і інш.

Міхаіл Паўлавіч Мысаўской (псеўданім М. Ольшанский) паходзіў з сялян Саратаўскай губерні. Працаваў чорнарабочым у гомельскіх чыгуначных майстэрнях, затым служыў у войску, пасля – канторшчыкам, памочнікам начальніка матэрыяльнай службы Лібава-Роменскай чыгункі. Перад закрыццём «Минского листка» быў яго рэдактарам.

Казімір Юльянавіч Чапінскі – сакратар рэдакцыі. Літаратурны псеўданім – К. Ч. У сакавіку 1905 года патрапіў пад суд за распаўсюджванне рэвалюцыйных ідэй.

Дарафей Дарафеевіч Бохан (4 лютага 1878, Мінск – 1942, Тэгеран) – рускі, беларускі і літоўскі журналіст, паэт, празаік, перакладчык, літаратуразнавец, крытык, публіцыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў Мінску, скончыў Полацкі кадэцкі корпус, потым пецярбургскае Канстанцінаўскае артылерыйскае вучылішча. У друку Д. Бо-

хан выступаў з 1897 года. Апублікаваў кнігу «Минские предания и легенды» ў друкарні Тасьмана (1901). Супрацоўнічаў з газетамі «Минский листок», «Северо-Западный край», «Голос провинции» (у 1907 годзе – адзін з рэдактараў газеты), «Минский голос», «Минские ведомости», «Северо-Западная жизнь», «Окраина», «Белорусская жизнь», «Северо-западное слово», пазней – супрацоўнік газет, якія выходзілі ў Віленскім краі: «Виленское утро», «Наша жизнь», «Наше время», «Русское слово». Псеўданімы і крыптонімы: Минчанин; А. Серебряный; Н.М. Серебрянский; М.И. Чернявский; Д. Слижень; Вова Крутиков; Додо; Д. Б.; Д; Н. С. і інш.

Міхаіл Паўлавіч Лукоўскі – адзін з прапагандыстаў Мінскай групы РСДРП.

Якаў Маркавіч Окунеў, пісьменнік, журналіст рэвалюцыйны дзеяч (1882–1932). Ён жа Янкель Шлеймавіч Окунь. Аўтар фантастычных раманаў, пісаў нарысы, апавяданні, запіскі аб падарожжах. Літаратурныя псеўданімы: О-в; Я.; Окунев, Я.; Окунев, Як.; Окунев, Яков; Я. О.; Я. Ч.; Чимишлийский, Я.






**Дарафей Бохан, журналіст і пісьменнік, супрацоўнічаў з газетай «Северо-Западный край»**

Працэсы, якія адбываліся ў грамадскай думцы Беларусі напярэдадні і ў час Першай рускай рэвалюцыі, супалі па часе з утварэннем палітычных партый і рухаў (БУНД – 1897 год; РСДРП –1898 год; ПСР – канец 1901 – пачатак 1902 года; ППС на Літве – 1902 год; БРГ – 1902 год) і паўплывалі на змену палітычнага курсу «Северо-Западного края» – ад ліберальнага да сацыял-дэмакратычнага. І. Хаўратовіч, аўтар-складальнік «Иллюстрированной хронологии истории Беларуси» ўжо ў постсавецкі час характарызаваў «Северо-Западный край» як «прагрэсіўную газету ліберальнага накірунку» *[3, с. 188]*. Кірунак дзейнасці газеты напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1905 года ахарактарызаваў беларускі даследчык М.В. Рожын: «на протяжении 1902, 1903 и значительной части 1904 г. „Северо-Западный край“ в тяжелейших условиях цензурного гнета по мере сил и возможностей и понимания складывавшейся исторической обстановки отстаивал экономические интересы самых широких народных масс, боролся за проведение в жизнь идей гуманизма, веротерпимости, гражданского и национального равноправия, настаивал на необходимости просвещения народных масс, требовал демократизации существующих форм общественной жизни и т. д. » *[4, с. 4]*.

«Северо-Западный край» у гэты перыяд змяшчаў розныя па сваёй ідэйнай накіраванасці артыкулы, карэспандэнцыі, нарысы. Я. Окунь у публікацыі «Журнальное обозрение. „Новый путь“, № 1, „Образование“, № 11–12» асуджаў ганебную практыку асобных органаў заходнееўрапейскага друку, якія ў пагоні за фінансавай выгадай «прадаюцца за пятак», не цураюцца змяшчаць ілжывыя звесткі, каб паўплываць на біржавыя спекуляцыі. І тут жа пісаў пра ролю рускіх газет і часопісаў у жыцці грамадства: «Конечно, будущее русской прессы – темно, но пока ничего подобного у нас, все-таки, быть не может, так как на нашей печати лежит весьма ответственная роль: она служит нам как бы кафедрой, с которой мощно звучит голос общественного мнения, тогда как заграницей тысячи ферейнов (объединения по интересам в иерархическую структуру. – *Авт.*), партийных организаций и парламент отняли у печати большую часть общественных задач. Но, кроме того, на нашей печати, сохранившейся пока от тлетворного веяния капитализма, лежит прямой долг заговорить об этом возмутительном факте. Она обязана бороться всеми силами против капитализации прессы, так как у нас на Руси тоже не все на этот счет обстоит благополучно…» *[5]*.

Аўтары газеты настойліва прапанавалі ўладам «прыглядзецца» да штодзённага жыцця простага народа, павышаць яго культурна-адукацыйны ўзровень шляхам пераймання найлепшага вопыту еўрапейскіх краін. Так, М. Ржэвускі звяртаў увагу чытачоў на адукацыйную дзейнасць доктара А. Нюстрэма (Швецыя), які лічыў, што барацьба з п'янствам, жабрацтвам, невуцтвам павінна ісці поруч з духоўным развіццём гарадскога пралетарыя. Дзейнасць вядомага асветніка па стварэнні новай навучальнай установы – Рабочага інстытута ў Швецыі – дазволіла даць пралетарыяту неабходны запас ведаў, пашырыць яго далягляд. Толькі ў 1900/01 навучальным годзе заняткі ў інстытуце наведалі 35 000 чалавек, якія вывучалі матэматыку, метэаралогію, геалогію, заалогію, хімію, гісторыю і інш. *[6]*.

Часопісныя агляды расійскіх выданняў, якія рэгулярна змяшчаў «Северо-Западный край», выходзілі далёка за жанравыя межы літаратурна-крытычнага артыкула. Пастаянная прысутнасць у публікацыях аўтарскіх думак, ацэнак і разважанняў на актуальныя для грамадства пытанні дазваляюць гаварыць аб пэўным сімбіёзе «журнального обозрения» і артыкула на палітычныя тэмы. Так лягчэй было абысці цэнзурныя рагаткі, якія скоўвалі свабоду слова яшчэ з часоў контррэформаў 1870–1880 гадоў.

Вялікую ўвагу газета ўдзяляла мастацкім творам прагрэсіўных пісьменнікаў, героі якіх служылі прыкладам для выхавання моладзі. М. Альшанскі ў публікацыі «Штрихи» пісаў: «русский читатель смотрит на литературу как на совершеннейшее выражение своих заветных чаяний и ждет от нее ответов на целый ряд назревших вопросов жизни» *[7]*. Я. Окунь у нататцы «Член общества изящных искусств в литературе» бязлітасна крытыкаваў мясцовую навуковую славутасць – доктара Нікольскага – за прапановы «изъять из обращения современной молодежи» творы Пушкіна, Тургенева, Чэхава, Горкага, Заля, бо знаёмства з імі не толькі не прыносіць карысці, але і шкодзіць. Непрымальную для рэдакцыі газеты пазіцыю займаў Нікольскі і ў дачыненні да мясцовага друку: «провинциальная пресса не смеет свое суждение иметь, а должна петь в унисон со столичной печатью… Дело провинциальной прессы – сплетни, пересуды и больше ничего» *[8]*. Але местачковыя погляды Нікольскага – гэта не той арыенцір, па якім павінна ісці маладое пакаленне, лічыў супрацоўнік газеты.

Гэтыя погляды падзялялі і іншыя пастаянныя аўтары «Северо-Западного края». М. Альшанскі ў артыкуле пад характэрным загалоўкам «Порнография» рэзка асуджаў гандаль парнаграфічнымі паштоўкамі на вуліцах буйных губернскіх цэнтраў, які дасягаў небывалых памераў. Гандляроў не спыняла нават тое, што распаўсюджвальнікі заманьваюць «малолетних учеников и учениц, которым дают рассматривать для приманки где-нибудь в воротах свои коллекции» *[9]*. Аўтар адзначаў, што правільнымі з'яўляюцца жорсткія дзеянні ўлад вялікіх і малых гарадоў па забароне карцін і фотаздымкаў непрыстойнага зместу і прыцягненні да судовай адказнасці вінаватых.

Рашуча выступала газета і супраць хаджэння ў шырокіх масах пралетарыяту і сялянства вялікай колькасці псеўданародных брашур. Так, аўтар публікацыі «Минск, 25 марта» адзначаў, што «народ живет в обществе Еруслан Лазаревичей и прочей дешевой литературы, которые… даже портят народный вкус». Журналіст заклікаў не толькі змагацца з народнай неадукаванасцю і папулярызаваць творы рускіх класікаў, але і паслядоўна пераадольваць засілле розных лубачных выданняў: «необходимо прийти на помощь народу с хорошей полезной книгой и художественно выполненной картиной, которая была бы способна воспитывать народ, развить его светлые задатки, направить его на светлый путь сознания» *[10]*.

У публікацыях эканамічнага характару рэдакцыя ставіла перад сабой задачу бараніць інтарэсы гаспадарчага развіцця насельніцтва ўсяго краю. Выданне змяшчала матэрыялы аб жорсткай эксплуатацыі рабочых і сялян, цяжкай працы жанчын, падлеткаў, якія за тую ж работу, што і мужчыны, атрымлівалі значна меншую заработную плату. Газета пісала пра цяжкія ўмовы працы, вялікую працягласць рабочага дня, калі працоўныя нават заставаліся без перапынку на абед. На гэтыя вострыя тэмы рыхтавалі матэрыялы Ф. Ястрэмскі, К. Чапінскі, мінскі прысяжны паверены А. Анекштэйн, Я. Чымішлійскі. На думку аўтараў газеты, меры, якія распрацоўваліся ўрадам С.Ю. Вітэ, былі недастатковыя для таго, каб радыкальна ўзняць прадукцыйныя сілы ў Расіі.

Крытыкавалася на старонках газеты і народніцкая эканамічная платформа (артыкулы К. Чапінскага «Благородство вместо программы»; «К аграрному вопросу» і інш.). Газета цалкам або ў скарочаным выглядзе перадрукоўвала асобныя эканамічныя працы У. Леніна («Падение Порт-Артура», «О реорганизации партии», «Историческая справка по аграрному вопросу», «Марксизм и неонародничество» і інш.), змясціла артыкулы С. Булгакава «О богатстве как экономическом идеале», А. Аксельрод (псеўд. – Ортодокс) «О „проблемах идеализма“». У шэрагу публікацый закраналіся пытанні крэдытавання, падаткаў, кааперацыі, суадносін палітыкі і эканомікі, пратэкцыянізму, сэрвітутаў, беспрацоўя, хутарызацыі. Найбольш значнай эканамічнай публікацыяй з'яўляўся курс лекцый па палітэканоміі пад загалоўкам «Научные беседы» (аўтар А. Анекштэйн). Гэты курс быў распрацаваны на аснове прац расійскіх эканамістаў і вядомых тэарэтыкаў Захаду. Праца А. Анекштэйна з'яўлялася адным з першых марксісцкіх даследаванняў па палітэканоміі.

## За свабоду слова

Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі, абвастрэнне класавай барацьбы ставілі перад супрацоўнікамі пытанне аб выпрацоўцы ўласнай палітычнай лініі. З кастрычніка 1904 года пачынаецца другі этап у дзейнасці рэдакцыі. Газета становіцца на абарону інтарэсаў рэвалюцыйных мас, звязвае сваю дзейнасць з прапагандай ідэй марксізму, які зацвярджаўся ў грамадскай думцы Расіі і Беларусі на мяжы XIX–XX стагоддзяў як светапогляд рабочага класа. На змену арыенціраў газеты напярэдадні Першай рускай рэвалюцыі паўплываў не толькі ўздым рэвалюцыйнага руху, але і практычная дзейнасць цэнтральных бальшавіцкіх выданняў: «Вперед», «Пролетарий», «Новая жизнь». Матэрыялы газеты «Северо-Западный край» аб рэвалюцыйнай барацьбе пралетарыяту, выступленнях рабочых Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Мінска і іншых гарадоў суправаджаліся інфармацыяй аб тым, што яе ўзначальвалі кіраўнікі мясцовых сацыял-дэмакратычных арганізацый (Палескі камітэт РСДРП створаны ў студзені, Паўночна-Заходні камітэт РСДРП – у сакавіку 1904 года. – *Аўт.*). За кароткі тэрмін членамі Мінскай бальшавіцкай групы РСДРП сталі М. Мысаўской, К. Чапінскі, А. Лукоўскі і іншыя супрацоўнікі выдання.

Прыватнаму падцэнзурнаму органу, якім з'яўляўся «Северо-Западный край», даводзілася падбіраць кожнае слова, каб абысці цэнзурныя забароны і данесці свае думкі, сваё бачанне вострых грамадскіх з'яў да чытачоў. У час рэвалюцыйных падзей 1905 года газета надрукавала артыкул «Свободная пресса» аб цэнзурнай палітыцы царызму на працягу апошніх дзесяцігоддзяў: «Судьбы русской печати в этот тяжелый период времени – это целый мартиролог, целое кладбище убитых мыслей, похороненных дум… Роковое veto накладывалось жестоко на всякое проявление свободной творческой мысли… За эти сорок лет было закрыто навсегда более 20 периодических изданий; за эти сорок лет наши журналы и газеты понесли общим числом 600 с лишком административных взысканий, многочисленное количество предостережений, которые объявлены были 66 повременным изданиям 251 раз… Вспомним деятельность добросовестных цензоров в николаевскую и последующую эпохи, отделявших „пшеницу от плевел“, считавших „глас правды мятежом, поэзию развратом“, искоренявших вредное направление… запрещавших в наше время употреблять слова „конституция“, „жандарм“, „рабочий вопрос“, „демонстрация“ и т. п.» *[11]*.

У другім артыкуле «К раскрепощению печати», падпісаным псеўданімам «М. К.», аўтар пісаў пра абмежаванасць палітычных свабод, абвешчаных Маніфестам 17 кастрычніка 1905 года: «Даже в настоящее время… когда уж открываются за мрачными стенами светлые, радужные перспективы грядущего правового строя свободной России, наши блюстители тишины и спокойствия, проектирующие уничтожить цензуру и заменить ее конфискацией вредных сочинений и судебным преследованием, никак не могут… обойтись без специальных кар против печати» *[11]*.

Газеце «Северо-Западный край» таксама давялося спазнаць увесь цяжар карных мерапрыемстваў цэнзуры. Яшчэ ў 1903 годзе афіцыйныя ўлады прызнавалі кірунак газеты «не заслуживающим поощрения».

М. Мысаўскога неаднаразова папярэджвалі, што яго адхіляць ад кіраўніцтва, калі газета будзе і надалей прытрымлівацца «вредного направления». Мінскі віцэ-губернатар Ф. Чарнцоў асабіста цэнзураваў газету, бязлітасна забараняў усе матэрыялы, якія супярэчылі афіцыйным поглядам. Рэпрэсіі ўзмацняліся па меры пераходу газеты на пазіцыі рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. Даносы і хадайніцтвы мясцовай губернскай адміністрацыі прывялі да часовага спынення выхаду «Северо-Западного края» з 10 чэрвеня 1905 года. Мінскі губернатар П. Курлоў спецыяльным цыркулярам забараніў газету як «крайне вредное издание», якое карысталася вялікім аўтарытэтам у чытачоў. Рэдактар М. Мысаўской быў арыштаваны і высланы на тры гады ў г. Пінегу Архангельскай губерні. Але па Маніфесту 17 кастрычніка 1905 года ён неўзабаве быў амнітаваны і вярнуўся ў рэдакцыю. У час, калі газета не выходзіла (10 чэрвеня – 28 кастрычніка 1905 года), замест яе выдаваліся «Утренние телеграммы типографии М. Мысавского». Выпуск газеты аднавіўся толькі праз чатыры месяцы. Пачынаючы з № 774 (1905 г.), на працягу 10 нумароў рэдактар М. Мысаўской друкаваў успаміны «В неволе», з якімі ён выступіў, вярнуўшыся з высылкі. Газета выступала за свабоду слова, поглядаў, дэманстрацый, заклікала насельніцтва абараняць здабытыя на барыкадах дэмакратычныя свабоды. Пасля 17 кастрычніка 1905 года «Северо-Западный край» выходзіў без папярэдняй цэнзуры.

Беларускі даследчык С.В. Говін адзначаў, што газета заняла прынцыповую і аб'ектыўную пазіцыю ў час так званага курлоўскага расстрэлу: «18 кастрычніка 1905 г. 20 тыс. жыхароў Мінска, не задаволеных царскім маніфестам 17 кастрычніка, прыйшлі на мітынг на плошчу каля вакзала Лібава-Роменскай чыгункі. Мінскі губернатар П. Курлоў даў загад паліцыі страляць у натоўп. У выніку былі забіты 52 і паранены 124 чалавекі». «Северо-Западный край» пазней паведамляў аб тым, як вялося следства, наладзіў збор грошай для дапамогі сем'ям тых, хто загінуў на Прывакзальнай плошчы *[12, с. 52]*.

У газеце «Северо-Западный край» змяшчаліся публікацыі па пытаннях рэлігіі, эстэтыкі, філасофіі, літаратурна-крытычныя артыкулы, прысвечаныя творчасці Л. Андрэева, М. Горкага, У. Караленкі, М. Салтыкова-Шчадрына, К. Станюковіча, Л. Талстога, Ф. Цютчава, А. Чэхава і інш. Выданне надрукавала перакладзены на рускую мову артыкул І. Франко аб творчасці польскай пісьменніцы М. Канапніцкай (Перекатиполе. Звезда народолюбивой поэзии, 1903, № 106), пазнаёміла чытачоў з творчасцю французскага літаратара Э. Заля (Бердяев, С. Лебединая песня художника-бойца, 1903, № 269). Д. Бохан вёў на старонках газеты рубрыку «Этюды о польских писателях» – аб творчасці А. Свентахоўскага (1902, № 37), А. Асныка (1903, № 289) і інш.

З'яўляючыся чулым барометрам грамадска-палітычнага і культурнага жыцця ў рэгіёне, «Северо-Западный край» горача падтрымліваў ініцыятывы працоўных мас, мясцовай інтэлігенцыі, скіраваныя на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, беларускай літаратуры. Парасткі нацыянальна-вызваленчага руху, нацыянальнай самасвядомасці прабіваліся цераз частакол урадавых забарон. У асяроддзі беларускіх дзеячаў узнікае ідэя стварэння тэатральных пастановак на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах. У сакавіку 1905 года ў раздзеле «Местная хроника» газета паведаміла аб ініцыятыве аўтараў «Северо-Западного края» К. Каставіцкага і Д. Бохана выпускаць на беларускай мове часопіс «Полессе». Хаця прашэнне, пададзенае ў Галоўнае ўпраўленне па справах друку, засталося без адказу, актуальнасць узнятага пытання не выклікала сумненняў – амаль усе, акрамя беларусаў, нацыянальнасці паўднёва-заходняй, заходняй і паўночна-заходняй ускраін Расіі мелі друкаваныя органы на нацыянальных мовах *[4, с. 150]*.

Нягледзячы на тое што з 1867 года царскі ўрад увёў забарону на выданне літаратуры на беларускай мове і на працягу наступных 30 гадоў не было надрукавана ніводнай беларускай кнігі, у краі паступова адраджалася беларускае пісьменства. У час Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў царскі ўрад пайшоў на ўступкі – уступіў у дзеянне закон аб свабодным друку, які паскорыў развіццё кнігавыдавецкай справы. «Северо-Западный край» пачаў публікаваць на беларускай мове казкі, легенды, песні, абрады. З'яўленне на старонках газеты матэрыялаў аб працы збіральнікаў этнаграфічнага матэрыялу ў расійскіх губернях таксама паслужыла каталізатарам дзейнасці беларускіх даследчыкаў. Аб гэтым у артыкуле «Из русской жизни и печати» пісаў ананімны аўтар выдання: «В деле сохранения памятников народного творчества на помощь людям науки

должны прийти и интеллигентные местные силы» *[13]*. На старонках «Северо-Западного края» друкаваліся этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя К. Каганцом, С. Барташэвічам, Р. Цяглай і інш. Аўтар, які друкаваўся пад крыптонімам «А. П.», рэгулярна змяшчаў у газеце матэрыялы пад рубрыкай «Белорусскія песни»: «А ня буду рэдзькі есці…» (1903, № 105); «Піў бы я мёд і віно…», «Ай, дубе, мой дубе…» (1903, № 166). Рыгор Цягла пад гэтай жа рубрыкай апублікаваў запісаны ў Віленскай губерні фрагмент паэмы «Чужазем», песню «Сын Даніла». Аўтар адзначаў, што «песни эти поют и стар и млад в деревнях Дисненского уезда; в особенности распространены они в Глубокской волости. Сочинены – очевидно давно и может быть заключают в себе какое-нибудь историческое сказание далекой старины. Песни эти принадлежат к чисто народному творчеству и по содержанию являются памятниками белорусского эпоса, начатками белорусской литературы» *[14]*.

Адна з публікацый К. Каганца – «Засульскіе Турэ» – была надрукавана на беларускай мове і змешчана пад рубрыкай «Белорусскія легенды» (1903, № 168). С. Барташэвіч апублікаваў матэрыял пра абрадавыя песні, якія спявалі сяляне на Магілёўшчыне ў першы дзень Новага года *[15]*. Старажытным традыцыям беларускага народа былі прысвечаны артыкулы Д. Бохана «Два слова о пережитках язычества у белорусов» (1903, № 88) і К. Каганца «Еще несколько слов о пережитках язычества у белорусов» (1903, № 113), падрыхтаваныя на аснове фальклорнага матэрыялу.

Дзейнасць «Северо-Западного края» па развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа асабліва інтэнсіўнай становіцца з пачаткам Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гадоў. Рэвалюцыйная барацьба працоўных аказала вялікі ўплыў на кансалідацыю беларускага руху, садзейнічала росту беларускай нацыянальнай культуры і беларускага друкаванага слова. Газета стала першым выданнем, на старонках якога дэбютаваў будучы класік беларускай літаратуры Я. Купала. 15 мая 1905 года на старонках «Северо-Западного края» быў надрукаваны яго верш «Мужык». Выданне паведамляла аб тым, што сярод сялянства вялікай папулярнасцю карыстаюцца выдадзеныя на беларускай мове рэвалюцыйныя вершы «Хрэст на свабоду», «Мора (Рэвалюцыя народная)» і «Пад штандарам» А. Пашкевіч (Цёткі).

Палітычная пазіцыя газеты, яе ўсеагульны ўплыў на насельніцтва краю моцна непакоілі не толькі мясцовыя ўлады, але і кіраўнікоў рэакцыйных газет «Западный Вестник», «Белорусский Вестник», якія дамагаліся забараніць выхад «Северо-Западного края», «предающего Россию». Даносы на папулярнае сярод насельніцтва выданне зрабілі сваю чорную справу. Канчатковы прысуд мясцовых улад газеце «Северо-Западный край» быў вынесены 8 снежня 1905 года. На 801-м нумары выданне газеты было спынена, супрацоўнікі, за выключэннем рэдактара, арыштаваны. М. Мысаўской добраахвотна з'явіўся ў паліцэйскае ўпраўленне 12 сакавіка 1909 года, дзе яму была ўручана копія абвінаваўчага акта. Суд над газетай, які адбыўся 4 мая, прызначыў быломy рэдактару штраф у памеры 100 рублёў, а газета «Северо-Западный край» была назаўсёды закрыта.

**Рукапіс верша Я. Купалы «Мужык», якім паэт дэбютаваў на старонках газеты «Северо-Западный край»**


Мужык.

Што я мужык, усе тут знаюць,
І як [illegible] гэта свет вялік,
З мяне смяюцца, пагарджаюць, -
Бо я мужык, дурны мужык.

Чытаць, пісаць я не умею,
Не ходзе гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею, -
Бо я мужык, дурны мужык.

Бо с працы хлеб свой дабываю,
Бо знаю [illegible] і крык,
І свята рэдка калі знаю, -
Бо я мужык, дурны мужык.

Галодны дзеці век без хлеба,
Падзёрты [illegible] [illegible],
Не маю грошы, а ні патрэбы, -
Бо я мужык, дурны мужык.

[illegible]

Такім чынам, газета «Северо-Западный край» адыграла важную ролю ў рэвалюцыйнай барацьбе пралетарыяту і сялянства Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя. Складанасць і супярэчлівасць грамадскага жыцця напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гадоў наклалі свой адбітак на праблематыку выдання, якое з ростам пралетарскага руху паступова змяшчалася з ліберальна-дэмакратычных пазіцый на пазіцыі рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. Газета тлумачыла чытачам сутнасць рэвалюцыйнай тэорыі пралетарыяту, вяла барацьбу з буржуазнай ідэалогіяй, агаляла заганы і язвы грамадскага жыцця, выказвала спачуванне прыгнечанаму народу, папулярызавала на сваіх старонках творы прагрэсіўных пісьменнікаў, змагалася з засіллем псеўданароднай літаратуры і лубачнага «мастацтва». Вялікі ўклад зрабіла газета ў развіццё нацыянальнай самасвядомасці і культуры беларускага народа, паслядоўна змагаючыся за яго раўнапраўе сярод народаў Расіі, за тэатр на роднай мове, яго самабытную культуру. Змяшчала на сваіх старонках песні, казкі, легенды на роднай мове, надрукавала першы верш будучага народнага паэта Беларусі Я. Купалы «Мужык». Барацьба газеты «Северо-Западный край» за права беларускага народа гаварыць і пісаць на роднай мове стала пуцяводнай зоркай для будучых рупліўцаў беларускай культуры.

***Фота з адкрытых крыніц***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.11.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Эръ. Злобы дня / Эръ // Северо-Западный край. – 1902. – № 9.
2. Мысавской, М. Ответ / М. Мысавской // Северо-Западный край. – 1903. – № 210.
3. Ховратович, И.П. Иллюстрированная хронология истории Беларуси / И.П. Ховратович. – 3-е изд., дополненное. – Минск: БелЭн, 2002. – 462 с.
4. Рожин, Н.В. Газета «Северо-Западный край». Очерк общественно-политической, философской и эстетической позиции. 1902–1905 гг. / Н.В. Рожин. – Минск: изд. БГУ, 1970. – 168 с.
5. Окунь, Я. Журнальное обозрение. «Новый Путь», № 1, «Образование», №№ 11–12 / Я. Окунь // Северо-Западный край. – 1903. – № 77.
6. Ржевусский, М. Журнальное обозрение. «Русская мысль», кн. 3–4, и «Мир Божий» / М. Ржевусский // Северо-Западный край. – 1903. – № 192.
7. Я. О. Член общества изящных искусств о литературе / Я. О. // Северо-Западный край. – 1902. – № 49.
8. Ольшанский, М. Порнография / М. Ольшанский // Северо-Западный край. – 1903. – № 299.
9. Минск, 25 марта // Северо-Западный край. – 1904. – № 415.
10. М.К. Свободная пресса / М.К. // Северо-Западный край. – 1905. – № 768.
11. М.К. К раскрепощению печати / М.К. // Северо-Западный край. – 1905. – № 782.
12. Говін, С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917) / С.В. Говін. – Мінск: БДУ, 2003. – 99 с.
13. Из русской жизни и печати // Северо-Западный край. – 1902. – № 38.
14. Тягла, Г. Белорусскія песни (Глубокская волость, Дисненского у. Виленской губ.) / Г. Тягла // Северо-Западный край. – 1902. – № 20.
15. Бартошевич, С. Новый год в деревне. Из быта белоруссов Могилевской губернии / С. Бартошевич // Северо-Западный край. – 1902. – № 20.